фонду СССР пры *Беларускім саюзе кампазітараў*. Члены саюза кампазітараў з'яўляліся адначасова і членамі М.ф.Б. Асн. мэты фонду: садзейнічанне кампазітарам і музыказнаўцам у развіцці іх творчай дзейнасці, павышэнні кваліфікацыі; арганізацыя і фінансаванне экспедыцый. Меў вытворчыя прадпрыемствы, нотныя магазіны. 2) Састаўная частка культ. фонду бел. нацыі, матэрыяльная муз. культура (у т.л. нотныя і фонадакументы), якая адлюстроўвае асн. этапы яе развіцця. Дакументы муз. культуры Беларусі захоўваюцца ў Нац. б-цы Беларусі (аддзел рукапісаў, старадрукаў і рэдкіх выданняў) і Бел. дзярж. архіве кінафотафонадакументаў, у архівах Цэнтр. дзярж. гіст. ў Санкт-Пецярбургу, Санкт-Пецярбургскага аддз. Ін-та гісторыі Рас. АН, Дзярж. гіст. Літвы ў Вільнюсе, Цэнтр. дзярж. гіст. Украіны ў Львове, б-ках АН Літвы, Вільнюскага ўн-та (у аддзелах рукапісаў), Універсітэцкай у Вроцлаве, Ягелонскай, Чартарыйскіх і Польскай АН у Кракаве, б-ках і архівах Германіі, Швецыі, Італіі, Англіі. З 1995 ажыццяўляецца паэтапнае выданне муз. помнікаў Беларусі творчым калектывам *«Беларуская капэла»*.

**МУЗЫ́ЧНЫЯ ІНСТРУМЕ́НТЫ**, прылады, з дапамогай якіх здабываюцца акрэсленыя (або недакладна акрэсленыя) па вышыні і рытмічна арганізаваныя (або неарганізаваныя) гукі, паслядоўнасці гукаў, а таксама шумы; састаўная частка матэрыяльнай і духоўнай культуры народа. У Беларусі вядомы са старажытнасці. М.і. звязаны са многімі сферамі жыцця чалавека — працай, абрадамі, паўсядзённым побытам. Ім прыпісваліся магічныя функцыі: вылечванне ад хваробы, адпужванне нячыстай сілы і інш. Большасць з іх мелі статус «мужчынскіх» інструментаў, ігра на якіх забаранялася жанчынам. Назіралася таксама сац. рэгламентацыя ў выкарыстанні М.і. Так, сярод дзяцей былі распаўсюджаны *свісцёлка*, *жалейка*, пастухі карысталіся *трубой*, *рогам*; паляўнічыя — *вабікам* і трубой; *балалайка*, *мандаліна* і *гітара* былі папулярныя ў асяроддзі вясковай інтэлігенцыі. Тыповым бел. інструм. ансамблем з'яўляецца т.зв. траістая музыка: *скрыпка*, *цымбалы*, *бубен*. М.і. вызначаюцца функцыямі самога інструмента (асаблівасці гучання, форма), абставінамі выкарыстання (у ансамблі, сола), спосабамі вырабу, спецыфікай асобы музыканта (аматар, прафесіянал). Важнай характарыстыкай М.і. з'яўляецца тэмбр, які залежыць ад канструкцыі, матэрыялу і спосабу вырабу кожнага інструмента. У наш час М.і. шырока выкарыстоўваюцца ў нар. жыцці і цесна звязаны з гісторыяй і нац. традыцыямі. Гл. таксама *Аркестр народных інструментаў*, *Народныя інструментальныя ансамблі*, *Народныя музычныя інструменты*, *Музычных інструментаў вытворчасць*.

*А.М.Аляхновіч.*

**МУЗЫ́ЧНЫЯ ТАВАРЫ́СТВЫ**, аб'яднанні прафесійных музыкантаў і аматараў музыкі. Маюць на мэце пашырэнне муз. культуры, папулярызацыю і вывучэнне муз. мастацтва ці асобных яго відаў. У Беларусі вядомы з канца 19 ст. — пач. 20 ст.: *Мінскае музычна-літаратурнае таварыства*, Мінскае муз. т-ва (1880), Віцебскае т-ва аматараў муз. і драм. мастацтва (1883), *Віцебскае музычна-драматычнае таварыства*, Брэсцкае муз.-драм. т-ва аматараў (1885), Магілёўскае (1886) і Мінскае (1893) муз.-драм. т-вы, Мінскі муз. гурток (1896), *Мінскае таварыства аматараў прыгожых мастацтваў*, *Магілёўскі музычна-драматычны гурток аматараў*, *Магілёўскі літаратурна-музычна-драматычны гурток*, *Мінскае літаратурна-артыстычнае таварыства*, *Віцебскі музычна-драматычны гурток*, Слуцкае літ.-артыстычнае т-ва (1906), *Беларускі музычна-драматычны гурток* у Вільні, *Мінскае таварыства сяброў музыкі*, т-вы імя А.Рубінштэйна ў Віцебску, «Музыку — масам» у Мінску (абодва 1920-я гг.). У 1933 створаны *Беларускі саюз кампазітараў*. У 1987 створана Муз. т-ва Беларусі (з 1995 *Беларускі саюз музычных дзеячаў*). М.т. падзяляюцца на выканаўчыя (харавыя, аркестравыя, камерныя), навук., асветніцкія, творчыя. Існуюць таксама нац. і міжнар. М.т.: сучаснай музыкі, музыказнаўства, выхавання, Міжнар. савет нар. музыкі і інш. Многія з іх уваходзяць у Міжнар. муз. савет пры ЮНЕСКА.

**МУ́ЛЕР** Канстанцін Аляксандравіч (5.7.1905, г. Санкт-Пецярбург — 15.4.1993), беларускі артыст балета, балетмайстар. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1956). У 1926 скончыў Ленінградскае харэагр. вучылішча. У 1926—46 (з перапынкамі) і 1960—73 працаваў у розных тэатрах, у т.л. у Вял. тэатры ў Маскве (1931—37). У 1937—41 саліст і балетмайстар, у 1946—60 гал. балетмайстар Дзярж. тэатра оперы і балета Беларусі. Сярод партый на бел. сцэне: Зігфрыд («Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Вацлаў («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Базіль («Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Раб («Карсар» А.Адана). На бел. сцэне паставіў балеты «Салавей» М.Крошнера (1950), «Падстаўная нявеста» Г.Вагнера (1958), «Марная засцярога» П.Гертэля (1938, 1959), «Дон Кіхот» (1941 і 1946), «Лебядзінае возера» (1938), «Спячая прыгажуня» (1954), «Шчаўкунок» (1956) П.Чайкоўскага, «Канёк-Гарбунок» Ц.Пуні і «Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева (абодва 1949),



*К.А.Мулер.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ